УДК 947.6(075.8)
ББК 63.3(4Бел)я73
К666

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ,
рэкамендавана секцыяй гуманітарных навук БДПУ
(пратакол № 7 ад 29.03.05)

*Рэцэнзенты:*
доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ *А. П. Жытко;*
кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры новай і навейшай гісторыі БДПУ *П. А. Тупік*

**Корзюк, А. А.**

К666 Шляхі фарміравання пазнавальнага інтарэсу вучняў у працэсе вывучэння гісторыі Беларусі ў школе (канец XVIII – пачатак XX ст.) : метад. дапам. / А. А. Корзюк; пад навук. рэд. І. І. Багдановіча. — Мн. : БДПУ, 2005. — 47 с.

У дапаможніку прапанаваны разнастайныя варыянты ўрокаў, змешчаны праблемныя заданні. Даюцца фрагменты з твораў мастацкай літаратуры. Выкарыстаны вопыт вывучэння ваенна-гістарычнага і культурна-гістарычнага матэрыялаў.

Адрасуецца студэнтам гістарычнага факультэта БДПУ.

УДК 947.6(075.8)
ББК 63.3(4Бел)я73

© Корзюк, А. А., 2005
© ВВЦ БДПУ, 2005

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»

**А. А. Корзюк**

# ШЛЯХІ ФАРМІРАВАННЯ ПАЗНАВАЛЬНАГА ІНТАРЭСУ ВУЧНЯЎ У ПРАЦЭСЕ ВЫВУЧЭННЯ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ШКОЛЕ (КАНЕЦ XVIII – ПАЧАТАК XX ст.)

*Метадычны дапаможнік*

8991
Бібліятэка
БДПУ імя М. Танка

Мінск 2005

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

На падставе гэтага вучні фармулююць вывад пра ўзмацненне саслоўнага прынцыпу ў навучанні, палітычнай рэакцыі і палітыкі русіфікацыі.

Пасля завяршэння вывучэння першага пытання настаўнік пераходзіць да характарыстыкі стану навуковых ведаў пра Беларусь.

2. Развіцце навуковых ведаў:

2.1.Праблемы развіцця навуковых ведаў *(тлумачэнне настаўніка):*

- Не існавала адзінай назвы народа і краіны;
- Панаванне польскай мовы ў культурным жыцці;
- Частае вызначэнне нацыянальнасці па рэлігійнай прыкмеце;
- Узмацненне палітыкі русіфікацыі.

2.2.Пабудова вучнямі табліцы "Развіцце ведаў пра Беларусь" з выкарыстаннем матэрыялу падручніка ходзе самастойнай работы з пунктам 2 параграфа 7.

Табліца 5.

**Развіцце ведаў пра Беларусь**

| Імя навукоўца | Погляды і навуковыя даследванні |
|---|---|
| З. Даленга-Хадакоўскі<br>І. Грыгаровіч<br>Я.Чачот<br>К.і Я. Тышкевічы<br>А. Кіркор<br>П. Шпілеўскі<br>П. Баброўскі | |

У час аналізу складзенай табліцы пажадана паказаць вучням публікацыі навуковых прац А.Кіркора (напрыклад, кніга "Живописная Россия"), зборнікі лірыкі Я.Чачота і інш.

У канцы урока пасля цэласнай характарыстыкі развіцця адукацыі і навукі, адбываецца фармулеўка вывадаў па матэрыялу ўрока аб іх стане ў І палове 19 ст. і перашкодах на шляху іх далейшага развіцця, такіх як:

•саслоўная накіраванасць;

•палітыка русіфікацыі;

•панаванне польскай мовы ў культурным жыцці;

•абмежаванасць сістэмы адукацыі і адсутнасць вышэйшых навучальных устаноў.

На падставе вышэйсказаннага настаўнік падводзіць вучняў да разумення таго, што развіцце адукацыі і навукі ў першай палове 19 ст. стрымлівалася феадальна-прыгонніцкім ладам.

На дом, акрамя § 7, можна прапанаваць асобным вучням апераджальнае заданне: падрыхтаваць паведамленні пра жыццё і творчасць А.Міцкевіча, Я.Баршчэўскага, П.Багрыма і іншых дзеячоў літаратуры І пал. 19 ст. на выбар настаўніка.



**Тэма "Літаратура" (§8).**

Перад урокам стаіць вялікая і важная задача–ахарактарызаваць важнейшыя рысы і асноўныя дасягненні ў развіцці беларускай літаратуры ў першай палове 19 ст. Яе выкананне залежыць ад паспяховага развіцця навыкаў характарыстыкі, аналізу і ацэнкі дзеячоў літаратуры і іх твораў і з'яўляецца важным сродкам выхавання нацыянальнай годнасці, патрыятызму, цікавасці і павагі да выдатных дзеячоў літаратуры першай паловы 19 ст. Перад правядзеннем урока настаўніку неабходна самому перачытаць некаторыя выбраныя творы польскіх і беларускіх паэтаў і пісьменнікаў першай паловы 19 ст., каб глыбей пазнаёміцца з іх біяграфіямі і зместам твораў. Гэта неабходна, каб вывучэнне новага матэрыялу атрымалася яркім, вобразна-эмацыянальным і змястоўна-канкрэтным. Карысна таксама будзе ўзгадніць аб'ём і змест плануемага для вывучэння на ўроку матэрыялу з настаўнікам беларускай мовы і літаратуры, які працуе ў гэтым класе з мэтай, каб вучні атрымалі цэласнае ўяўленне аб асаблівасцях развіцця літаратурнага працэсу ў першай паловы 19 ст.

Пажадана, каб на ўроку выкарыстоўваліся выданні твораў А.Міцкевіча, Я.Чачота, В. Дуніна-Марцінкевіча, Я.Баршчэўскага, паэмы "Энеіда навыварат" і "Тарас на Парнасе".

Магчыма арганізацыя вучэбнай дзейнасці вучняў двума спосабамі.

Пры першым спосабе асноўная частка ўрока будуецца з дапамогай прагляду вучэбнага відэафільма "Культура беларускіх зямель у канцы 18–сярэдзіне 19 ст." і выканання тэматычных заданняў да яго:

***ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДА ВУЧЭБНАГА ВІДЭАФІЛЬМА «КУЛЬТУРА І АСВЕТА БЕЛАРУСІ КАНЦА 18 – ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ 19 СТАГОДДЗЯ»***

1.Якімі былі формы правядзення вольнага часу ў беларусаў

2.Галоўная перашкода для развіцця нацыянальнай культуры ў гэты перыяд.

3.У чым культурная і літаратурная заслуга Адама Міцкевіча?

4.Чаму прысвяціў сваё жыццё Ян Чачот? Назавіце яго творы.

5.Які твор параўноўвалі са зборнікам казак «Тысяча і адна ноч»? Чаму? Назавіце яго аўтара.

6.Пракаменціруйце меркаванне У. Сыракомлі пра беларускую мову.

7.Дайце назву афіцыйнай палітыкі царызму ў Беларусі.

8.Хто лічыцца заснавальнікам беларускага тэатра? Калі ім была напісана першая беларуская опера і як яна называлася?

9.Чым славуты С. Богуш-Сестранцэвіч?

10.Назавіце гарады – цэнтры культуры і асветы Беларусі гэтага часу.

11.Якія тайныя таварыствы зарадзіліся ў Віленскім універсітэце? Якія знакамітыя дзеячы культуры належалі да іх? У чым заключалася іх дзейнасць?

12.Якім быў лёс Віленскага універсітэта? Чаму?

13.Якія змены ў культурнай палітыцы і чаму адбываюцца ў Беларусі ў 30-40-я гг. 19 ст.?



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ